УДК 37. 091. 3: 811. 161. 3’367.333

# ВЫВУЧЭННЕ АЗНАЧЭННЯ Ў ШКОЛЕ І ВНУ

**Цімашэнка Н.П., канд. філал. навук, дацэнт**
*Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны*
*Гомель, Рэспубліка Беларусь*

Азначэнне займае важнае месца ў сінтаксічнай структуры простага сказа, і вывучэнне гэтага даданага члена сказа выклікае нямала цяжкасцей. Як вядома, даданыя члены сказа знаходзяцца ў падпарадкавальнай сувязі з галоўнымі членамі сказа ці паміж сабою і служаць для іх паяснення, удакладнення. Даданымі яны называюцца і таму, што яны не ўваходзяць у састаў прэдыкатыўнай асновы. Іх наяўнасць не заўсёды абавязковая ў структуры сказа. Аднак даданымі члены сказа называюцца з пункту гледжання структуры сказа, а не з боку семантыкі, сэнсу і зместу. Пры вывучэнні таго ці іншага даданага члена трэба ўлічваць наступныя фактары: семантыка-сінтаксічная функцыя даданага члена ў сказе; яго марфалагічнае выражэнне; граматычныя сродкі, якія звязваюць яго з азначаемым ім словам; лексічнае значэнне даданага члена і слова, з якім ён звязаны ў сказе. Азначэнне – гэта даданы член сказа, які адносіцца да слова з прадметным значэннем і характарызуе прадмет з боку яго якасці, уласцівасці: ***Першыя*** *замаразкі ўбіралі інеем* ***астуджаную*** *зямлю* (М. Лынькоў).

У залежнасці ад марфалагічнага выражэння і характару сінтаксічнай сувязі з азначаемым словам усе азначэнні падзяляюцца на дапасаваныя і недапасаваныя. Такія ж разнавіднасці вылучаюцца ў школьным падручніку па беларускай мове для восьмага класа [1, с. 97]. Дапасаваныя азначэнні выражаюцца тымі часцінамі мовы, якія здольныя прыпадабняцца да паяснёнага слова ў ліку і склоне, а ў адз. ліку і ў родзе: *чырвоная сукенка, цікавы фільм, наша дзяцінства.* Пры разглядзе тэмы “Азначэнне” неабходна падкрэсліць, што азначэннем нельга лічыць прыметнікі, якія ўваходзяць у склад устойлівых іменных спалучэнняў тыпу *Новы год, Чорнае мора, блакітны экран*. Дапасаваныя азначэнні звязваюцца з паяснёным назоўнікам спосабам дапасавання. Тут варта ўзгадаць, якія віды падпарадкавальнай сувязі існуюць паміж

кампанентамі словазлучэнняў, і спыніцца на дапасаванні і на тых часцінах мовы, якія здольныя дапасоўвацца ў родзе, ліку, склоне. У гэтым праявіцца цесная сувязь паміж сінтаксісам і марфалогіяй. Дапасаваныя азначэнні выражаюцца наступнымі часцінамі мовы: 1) якаснымі, адноснымі і прыналежнымі прыметнікамі: ***Цёмная*** *ноч апранула зямлю*; ***Гомельскія*** *вуліцы чыстыя і прыгожыя*; ***Мікітава*** *хата стаяла на ўзлеску;* 2) займеннікамі: ***Той*** *дзень запомніўся на ўсё жыццё;* 3) парадкавымі лічэбнікамі: *Настаў* ***другі*** *дзень жніва*; 4) дзеепрыметнікамі: *Душы* ***пакрыўджанай*** *гарачыя дакоры слязой халоднаю застылі на траве* (А. Куляшоў); 5) дзеепрыметнымі і прыметнікавымі зваротамі: *Крынічка,* ***спакойная на паверхні,*** *выкідала з глыбіні сваёй пясчаныя фантанчыкі* (У. Карпаў); ***Асветлены бяссоннымі ліхтарамі горада****, блішчыць гранітнай чырванню абеліск на брацкай магіле воінаў і партызан* (Я. Брыль). Дапасаваныя азначэнні, выражаныя дзеепрыметнымі і прыметнікавымі зваротамі, часта сустракаюцца ў беларускай мове. Таму неабходна звяртаць увагу як студэнтаў, так і вучняў на такія сінтаксічныя канструкцыі. На жаль, у школьным падручніку разглядаюцца толькі неразвітыя дапасаваныя азначэнні [1, с. 97]. Па гэтай прычыне навучэнцы не заўсёды правільна вызначаюць сінтаксічную функцыю дзеепрыметных і прыметнікавых зваротаў, падкрэсліваючы іх не адным членам сказа, а разбіваючы на асобныя.

Недапасаваныя азначэнні не прыпадабняюцца да форм паяснёнага слова, а звязваюцца з ім спосабам кіравання (*верш Коласа*) ці прымыкання (*рашэнне выехаць*). У ролі недапасаваных азначэнняў могуць выступаць: 1) назоўнікі ва ўскосных склонах з прыназоўнікам і без яго: *Шум* ***з вуліцы*** *напоўніў кватэру*; 2) інфінітыў: *Даўно ўжо бацька жыў думою* ***разжыцца*** *уласнаю зямлёю* (Я. Колас); 3) прыналежныя займеннікі *яго, яе, іх*: *Перш за ўсё памяць маёй зямлі – гэта людзі і* ***іх*** *вечная, неўміручая праца* (У. Караткевіч); 4) прыслоўі: *Па дарозе* ***дадому*** *сябры любаваліся мясцовымі краявідамі* (Я. Колас); 5) дзеепрыслоўі: *Язда* ***стоячы*** *прытаміла хлопца* (ЛіМ); 6) нескланяльныя прыметнікі: *Ёй падабаўся колер* ***хакі***; 7) сінтаксічна непадзельныя словазлучэнні: *Там знаходзілася невялікая вёсачка* ***на некалькі вуліц***. Такая характарыстыка недапасаваных азначэнняў падаецца ў школьным падручніку ў выглядзе табліцы, што, на нашу думку, спрыяе лепшаму засваенню матэрыялу [1, с. 98–99]. Насупраць

кожнага прыклада падаецца і від сувязі паміж галоўным і залежным кампанентам такіх канструкцый. Аднак нельга пагадзіцца з тым фактам, што ў словазлучэнні *адказы яго* кампаненты звязаны пры дапамозе кіравання [1, с. 99]. Вядома, што пры кіраванні залежны кампанент – зменная часціна мовы, а прыналежныя займеннікі *яго, яе, іх* нескланяльныя (у адрозненне ад ускосных форм асабовых займеннікаў *ён, яна, яно, яны*). Такім чынам, мэтазгодна лічыць, што ў канструкцыі *адказы яго* кампаненты звязаны спосабам прымыкання. Спалучэнні *палёт Мінск–Масква* і *на вышыні 6 кіламетраў* разгледжаны ў школьным падручніку як словазлучэнні з прымыканнем. Аднак пры прымыканні ў якасці залежных кампанентаў выступаюць нязменныя часціны мовы, чаго нельга сказаць пра словаформы, якія выступаюць тут у ролі азначэнняў. У канструкцыі *палёт Мінск–Масква* залежны кампанент мэтазгодна разгледзець як прыдатак (разнавіднасць азначэння), а прыдаткі, як вядома, выражаюцца назоўнікамі і дапасуюцца ў склоне. У канструкцыі *на вышыні 6 кіламетраў* кампаненты звязаны пры дапамозе кіравання. У вну ў адрозненне ад школы падкрэсліваецца, што члены сказа могуць быць марфалагізаванымі і немарфалагізаванымі. Члены сказа, выражаныя часцінамі мовы, для якіх дадзеная сінтаксічная функцыя з'яўляецца асноўнай, называюцца марфалагізаванымі. Члены сказа, выражаныя часцінамі мовы, для якіх дадзеная сінтаксічная функцыя з'яўляецца другараднай, называюцца немарфалагізаванымі. У выніку гэтага становіцца зразумела, што дапасаваныя азначэнні з'яўляюцца марфалагізаванымі, а недапасаваныя – немарфалагізаванымі. Акрамя таго, пры размежаванні дадзеных членаў сказа вельмі часта можна карыстацца наступным правілам: немарфалагізаваныя члены сказа часта можна замяніць марфалагізаванымі, якія дакладна падкажуць сінтаксічную ролю залежнага кампанента (*песня маці – матчына песня*, *жыццё на фронце – франтавое жыццё*).

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Бадзевіч, З.І. Беларуская мова: вучэб. дапам. для 8-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / З.І. Бадзевіч, І.М. Саматыя. – 2-е выд., перапрац. і дап. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2015. – 288 с.